# Калейдаскоп

снежань 2021

**Школьная газета №4(34)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**снежань 2021**

**Замежныя дзеячы пра родную мову**

Толькі дасканала засвоіўшы родную мову, мы ў стане будзем гэтак жа дасканала засвоіць і мовы замежныя. **(Ф.Дастаеўскі)**

Што ні кажы, а родная мова заўсёды застаецца роднай. Калі хочаш казаць ад душы, ніводнае французскае слова ў галаву не ідзе, а калі хочаш бліснуць – іншая справа. **(Л.Талсты)**

Мова не можа быць дрэннай, або добрай … Бо мова – гэта толькі люстэрка. Тое самае люстэрка, на якое нельга наракаць. **(С.Даўлатаў)**

Усе найгалоўныя замежныя мовы можна вывучыць за шэсць гадоў, але для вывучэння сваёй недастаткова і цэлага жыцця. **(Вальтэр)**

Мова, якой мы карыстаемся, уплывае на наша мысленне … **(Б.Вебер)**

Калі мова чалавека млявая, цяжкая, нямоглая, нявызначаная,не вельмі адукаваная, то такі, напэўна, і розум гэтага чалавека. **(І.Гердэр)**

Найвялікшая багацце народа – яго мова! Тысячагоддзямі назапашваюцца і вечна жывуць у слове незлічоныя скарбы чалавечай думкі і вопыту. **(М.Шолахаў)**

Неўміручасць народа – у яго мове. **(Ч.Айтматаў)**

Нездарма шматпакутныя народы, пераносячы самыя страшныя ўдары лёсу, не могуць толькі перанесці пагібелі роднага слова… **(Н.Катлярэўскі)**

Кожная мова мае свой словарух, сваю гармонію, і дзіўна было б рускаму ці італьянцу, або ангельцу пісаць для французскага вуха і наадварот. **(К.Бацюшкаў)**

Мова – вопратка думак. **(С.Джонсан)**

Мова народа – лепшы колер усяго яго духоўнага жыцця, які ніколі не вяне і вечна зноў распраўляецца. **(К.Ушынскі)**

Стварыць мову немагчыма, бо яе стварае народ; філолагі толькі адкрываюць яе законы і прыводзяць іх у сістэму, а пісьменнікі толькі твораць на ёй адпаведна з гэтымі законамі. **(В.Бялінскі)**

Хто не ведае замежных моў, той нічога не ведае і пра сваю мову. **(І.Гётэ)**



# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**снежань 2021**

## Снежань

*Снежань зіму пачынае, а год канчае.*
*Снежань сцюжны з зімою дружны.*
*Снежань вока снегам цешыць, ды марозам вуха рве.*
*Сухі снежань – сухая вясна, сухое лета.*

Першы месяц зімы і апошні каляндарнага года атрымаў назву **снежань** ад слова "снег". Старабеларускае найменне яго – прасінец (у значэнні "прасвет у воблаках"), стараРускае – студеный. Рускі декабрь, англійскі December паходзіць ад лацінскага december (дзесяты – у старажытнарымскім календары). Здавён у гэтым месяцы асноўная праца сялян пераходзіла ў хату. Доўгімі зімовымі вечарамі гарэла лучына ў пасвеце ці на лучніку. Мужчыны займаліся дробным рамяством, рамонтам. Жанчыны ж пасля сядзення за грэбенем ці прасніцаю браліся ткаць кросны. Раней яны стаялі амаль у кожнай хаце. Добра быў развіты прагноз надвор`я, стан будучай вясны па зімовых прыкметах. Народныя веды замацоўваліся ў трапным прыказках і прымаўках. Снежань жыў чаканнем калядных свят.

**4/21. Увядзенне** (Вадзенне, Уводзіны). Звязана з хрысціянскім святкаваннем Увядзення ў храм Прасвятой Уладаркі нашай Багародзіцы і Прыснадзевы Марыі. Бяздзетныя бацькі Іаакім і Ганна паабяцалі, што ў выпадку нараджэння ў іх дзіцяці, прысвецяць яго на служэнне Богу. І вось у гэты дзень трохгадовая Прыснадзева пры запаленых свечках падымаецца па пятнаццаці прыступках храма і першасвятар уводзіць яе ў Святыя Святых. Для хрысціян гэтае свята – сімвал увядзення грэшнага свету ў храм, без якога ён загіне, пачатак уратавання. У народзе назва прысвятка звязана са словам "вядзенне". Кажуць: *"Увядзенне, што свят навядзе", "Увядзенне прыйшло – зіму прывяло."*

**9/26. Юр`е Зімовы** (Юр`еў дзень, Ягорый). У царкоўным календары – Асвячэнне храма Велікапакутніка Георгія ў Кіеве. На Юр`е зіма ўбіраецца ў поўную сілу. Аб гэтым сведчаць прыказкі і прыкметы: *"Юры мосціць, а Мікола гвоздзіць", "Колькі на асенняга Юр`я снегу, столькі на вясенняга – травы"*. Юрый лічыўся апекуном свойскай і лясной жывёлы. У гэты дзень ён нібы выпускаў ваўкоў аж да вясенняга Юр`я. Гаспадары аглядалі кароў, коней. Больш не выганялі на пашу кароў, бо: *"Юрэй ужэ дае ваўкам слабоду"*. Вядома гістарычная прыказка: *"Вось табе, бабуля, і Юр`еў дзень"*. Ад Юр`я сялянам не дазвалялася пераходзіць на службу ад аднаго пана да другога.

**13/30. Андросы** (Андрос, Андрэй, Андрэйкі). Дзявочае свята. Народная традыцыя амаль нічым не звязана з хрысціянскім праслаўленнем апостала Андрэя Першазванага. Гэта адзін з 12 вучняў Хрыста, брат апостала Пятра. Пасля зыходжання Святога Духа апостал Андрэй з Віфсаіды прапаведаваў у І стагоддзі Евангелле ў розных краінах, у тым ліку і на славянскіх землях. Празваны Першазваным таму, што першы быў прызваны Хрыстом на апостальскае служэнне. Беларуская народная традыцыя захавала нямала абрадаў, гульняў, прыкмет і, асабліва, варожбаў на гэты дзень.

# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**снежань 2021**



**19/6. Мікола Зімовы** (Міколы, Мікольшчына). Багата адлюстраваны ў прымаўках: *"Без Міколы не бывае ні зімы, ні лета", "Хвалі зіму на Міколе", "Да Міколы няма зімы ніколі"*. Як і многія святы і прысвяткі ў гонар гістарычных асоб, і гэты дзень, што прызначаны свяціцелю Мікалаю, архіепіскапу Мір Лікійскіх, цудатворцу, сваім зместам не адлюстроўвае ні біяграфію, ні жыццёвых подзвігаў гэтага вядомага не толькі ў хрысціянскім свеце чалавека, які жыў у другой палове III стагоддзя ў Малой Азіі.

Адвент. Тры тыдні перад Раством. Каталіцкае свята непарочнага зачацця Божай Маці. Хрысціянская царква разглядае Адвент як час духоўнай падрыхтоўкі да святкавання Нараджэння Хрыстова, якое заключаецца ў посце і пакаянні.

**22/9. Ганны** (Ганкі, Ганна). Прысвятак, ад якога да Каляд застаецца роўна два тыдні. Яшчэ фалькларыст М. Нікіфароўскі заўважаў: *"Па зіме і лета", – звычайна гавораць пра летняе надвор`е, калі параўноўваюць яго з перажытым зімовым. Гэтае параўнанне ідзе ад зімовае Ганны і ад дня павароту сонца на зіму (22 чэрвеня), што адбываецца за 20 дзён да Пятра"*. Гэты прыкметны ў годзе дзень (з астранамічнага пункту погляду – 21–22 снежня з`яўляецца днём зімовага сонцастаяння, на што вялікую ўвагу звярталі яшчэ язычнікі) прысвечаны шанаванню праведнай Анны, маці Багародзіцы. Каталікі прысвячаюць гэтай падзей 26 ліпеня, дзень блізкі да летняга раўнадзенства.

**24/11. Посная куцця**. Пачатак Каляд (да 6 студзеня). Дзяўчаты варажылі, ці хутка выйдуць замуж. Насілі з песнямі "звязду". Бытавалі прыказкі і прымаўкі звычайна тыя ж, што і ў праваслаўных: *"Прыйшлі Калядкі, гаспадарам парадкі", "Калядкі – добрыя святкі: бліны ды аладкі", "На Каляды ясна – ясна й на Пятры"*.

**25/12. Раство каталіцкае (Каляды).**

**31/18. Багатая (Шчодрая) куцця** (гл. 13 студзеня). **Новы год**. У самы апошні дзень года наглядалі за прыродай, надвор`ем: якое надвор`е перад Новым годам – такое будзе й перад Пятром; светлае неба – на багатую Куццю, вясёлы год; калі перад Васілём (1 студзеня) снег – чакаецца добры ўраджай.

# Займальны матэрыял

**Калейдаскоп**
**снежань 2021**

## Пазнавальная віктарына

**1.Святам чаго лічыцца Новы год у Кітаі?**
а) гірлянд; б) ліхтароў: в) феерверкаў.

**2. Што бяруць з сабой грэкі, выпраўляючыся ў госці на сустрэчу Новага года?**
а) карункавую хустачку; б) прыбраную шкатулку; в) замшэлы камень.

**3. Якая любімая навагодняя забаўка ў маладых жанчын Карэі?**
а) скачкі на дошках; б) запусканне паветранага змея; в) узрыванне петард.

**4. Што робяць балгары ў навагоднюю поўнач з апошнім ударам гадзінніка?**
а) гасяць святло: б) адчыняюць дзверы; в) крычаць у форткі.

**5. З чым можна сустрэць калумбійцаў за дзень да навагодняга свята?**
а) з букетамі кветак; б) з самаробнымі лялькамі; в) з вялікімі авоськамі.

**6. Каго ў Гвінеі прынята вадзіць па вуліцах у першы дзень Новага года?**
а) кароў; б) коней; в) сланоў.

**7. На чым прыбывае пад Новы год французскі Дзед Мароз?**
а) на дошцы для сёрфінгу; б) на каньках; в) на санях.

**8. Што венгры раскупляюць у пераднавагоднія дні?**
а) барабаны; б) дудачкі; в) маракасы.

**9. На які перыяд даводзіцца Новы год у Бірме?**
а) на сярэдзіну красавіка; б) на канец верасня; в) на пачатак чэрвеня.

**10. Што ўпрыгожваюць пад Новы год у В’етнаме?**
а) піхту; б) фінікавую пальму; в) бамбук.



# Папулярызацыя беларускай мовы



**«Восеньскія плады і насенне, гароднiна і садавiна – крынiца вiтамiнаў. Правілы ўжывання гароднiны і садавiны»**

2 снежня ў **3 «Б»** класе, у рамках беларускамоўнага чацвярга, прайшло мерапрыемства **«Восеньскія плады і насенне, гароднiна і садавiна – крынiца вiтамiнаў. Правілы ўжывання гароднiны і садавiны».**

Падчас мерапрыемства дзецi з цiкавасцю выконвалі розныя заданні: пазнаёміліся з новымі словамі, разгадвалі крыжаванку, перакладалі з рускай мовы на беларускую, пашыраючы свой слоўнікавы запас.

Вучні даведаліся аб карысці садавіны і гародніны для здароўя, што спатрэбіцца гаспадыні, каб зварыць боршч і кампот.

**Настаўнік 3 «Б» класа Гарачая А.Ф.**






# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**снежань 2021**

**«Нязгасная зорка Радзімы»**

16 снежня ў рамках беларускамоўнага чацвярга вучні 8 «Г» класа прынялі ўдзел у мерапрыемстве «Нязгасная зорка Радзімы», прысвечанае 130- годдзю з дня нараджэння найвыдатнейшага беларускага паэта Максіма Багдановіча. Васьмікласнікі пашырылі свае веды пра жыццё і творчасць паэта, узгадалі творы, якія вывучалі ў гэтым навучальным годзе і ў папярэдніх класах, праслухалі вершы, пакладзеныя на музыку. Наведалі выставу ў школьнай бібліятэцы і здзейснілі віртуальную экскурсію ў літаратурны музей Максіма Багдановіча ў Гародне. Напрыканцы мерапрыемства школьнікі замацавалі свае веды, разгадаўшы крыжаванку і адказаўшы на пытанні віктарыны.

Настаўнік беларускай мовы і літаратуры В.В.Маргунова






# Юбілейныя даты






Ёсць у беларускай літаратуры асобы, лёс якіх прыцягвае ўвагу даследчыкаў ўжо не адно дзесяцігоддзе. У іх ліку - славуты сын зямлі беларускай Максім Багдановіч. Яшчэ у раннім дзяцінстве яго разлучылі з радзімай, куды ён ірваўся ўсім сэрцам, але змог вярнуцца толькі ў канцы жыцця.

Максім Багдановіч вымушаны быў доўгі час жыць у глыбіні Расійскай імперыі. Але гэта не перашкодзіла яму горача палюбіць і самастойна вывучыць беларускую мову.

Ужо тут у Яраслаўлі ў жыцці Максіма Багдановіча адбудзецца важная падзея. Паэт сустрэне сваю галоўную музу - Ганну Какуеву, якой пазней прысвеціць свой знакаміты раманс «Зорка Венера». Менавіта ён ужо некалькі дзесяцігоддзяў з'яўляецца гімнам рамантыкаў, народжаных пад зоркай Багдановіча.

Любоўныя пакуты толькі паўплывала на яго пісаць яшчэ больш. А таму ўжо ў 1914 годзе быў надрукаваны галоўны і адзіны зборнік твораў Максіма Багдановіча «Вянок». А яшчэ праз два гады ажыццявілася даўняя мара. Ён вярнуўся ў родны Мінск.

Нягледзячы на тое, што Максім Богдавновіч быў ужо цяжка хворы, ён вельмі шмат працаваў і не пераставаў пісаць. Аднак нядоўга, на жаль, ужо ў 1917 годзе ён вымушаны будзе з'ехаць у Ялту на лячэнне, так і не здейсніўшы яшчэ адну мару.

«Па-над белым пухам вішань», «Вераніка», «Слуцкія ткачыхі»... Ужо сёння вершы Багдановіча – ведаюць не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі.

# Юбілейныя даты






**Мікалай Аляксандравіч** — беларускі паэт, перакладчык, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (1970), Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1992), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2002), Рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор года “Залаты Купідон” (2012).

Нарадзіўся 13снежня 1941 г. у вёсцы Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям’і. Пасля заканчэння Мікалаеўшчынскай сярэдняй школы (1958) два гады працаваў на лесанарыхтоўках у Карэліі. У 1965 г. скончыў філалагічны факультэт БДУ. Настаўнічаў у Воранаўскім і Крупскім раёнах, служыў у Савецкай Арміі, працаваў у рэдакцыі нясвіжскай раённай газеты «Чырвоны сцяг», старшым рэдактарам на Беларускім радыё. З 1969 г.— старшы рэдактар рэспубліканскага метадычнага кабінета Міністэрства культуры БССР, з 1976 г.— старшы рэдактар галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання.

З 1980 г. — супрацоўнік часопіса «Вясёлка».

Друкавацца пачаў у 1957 г. (газета «Чырвоная змена»). Выйшлі зборнікі паэзіі «Едуць маразы» (1966), «Жалеза» (1970), «Лотаць» (1973), «Круг» (1977), «Эстакада» (вершы і паэма, 1982), «Дар» (вершы і паэма, 1985), «Аднавякоўцы» (вершы, балады, байкі, 1988). Для дзяцей выдаў кніжкі вершаў і казак «Дзед і ўнучка» (1983), «Салодкі лядзяш» (1986), «Як дом будавалі» (1987), «Дзе жывуць казкі» (1994), «Запрашаем на калядкі» (1998), «Папялушка» (2000), «Пачынайце дзень з усмешкі» (2013), «З вудай на вясёлцы» (2013), кнігу прозы «Коласаў абярэг: дзецям пра Якуба Коласа» (2011).

# Літаратурная старонка



Максім Багдановіч

## Зімой

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной стаяць,
У небе зоркі ад марозу
Пахаладзеўшыя дрыжаць.

Вільготны месяц стуль на поле
Празрысты, светлы стоўп спусціў
І рызай срэбнаю раздолле
Снягоў сінеючых пакрыў.

Ўзрывайце ж іх санямі, коні!
Звіні, вясёлых бомаў медзь!
Вакол лятуць бары і гоні,
Ў грудзях пачала кроў кіпець.



# Цікава ведаць

Калейдаскоп
снежань 2021

### *Прыказкі і прымаўкі пра зіму*

- ***Жнівень збірае, ды вось зіма усё праядае.***
- ***Больш снегу — больш хлеба.***
- ***У пачатку зімы ішоў моцны снег, у пачатку лета пойдзе моцны дождж.***
- ***Вераб'і дружна цвыркаюць - гэта да цяпла.***
- ***Вароны і галкі садзяцца на поўдзень дзюбамі - да цяпла, на поўнач - да холаду.***
- ***Рыхтуй сані летам, а калёсы зімой.***
- ***Дзень цемны, ды ноч светлая (зімою).***
- ***Доўгія ледзяшы ў канцы лютага — да доўгай вясны.***
- ***Днём быў моцны мароз, а да вечара пацяплела — чакай доўгую сцюжу.***
- ***Дым з трубы слупом — да халадоў.***
- ***Калі зімой завірухі - летам непагадзь.***
- ***Калі зімой суха і холадна, то і летам будзе суха і горача.***
- ***Калі зімой цёпла - летам будзе холадна.***
- ***Калі зімою завірухі, то летам чакай непагадзь.***
- ***Калі зімою іней - то летам раса.***
- ***Зіма ноччу ў двор на дыбачках крадзецца.***
- ***Шэрань - прадвеснік снегу.***
- ***Шэрань на Міколу — да ўраджаю на наступны год.***
- ***Як у лютым гукнецца, так увосень адгукнецца.***
- ***Якая Аксіння, такая і вясна.***
- ***Якое надвор'е на Стрэчанне, такая і вясна.***
- ***Калі зіма здарыцца летам, а лета — зімою, добрых хлябоў не чакай.***
- ***Калі ў снежні частыя вятры, то ў сакавіку і красавіку на двары будзе золь.***

# Цікава ведаць



**Калі настае Новы год**

Новы год – гэта самае старажытнае свята з усіх, якія толькі існуюць на зямлі. Першымі зрабілі запіс пра святкаванне Новага года яшчэ ў Вавілоне, у другім тысячагоддзі да нашай эры. З таго часу Новы год святкуецца весела і шумна, а само свята стала прыгожай традыцыяй. Гэта цудоўнае, светлае свята ўсе народы адзначаюць па-свойму, паводле непаўторных звычаяў. Праўда, гэты дзень выклікае аднолькавыя пачуцці радасці і надзеі на лепшую будучыню. Танцы, песні, гульні, святочная варажба прыносяць задавальненне ўсім людзям. Напрыклад, немцы ў навагоднюю ноч складаюць прагноз надвор'я на год. Яны робяць гэта так: дванаццаць цыбулін – па колькасці месяцаў – кладзецца на стол. Папярэдне ў кожнай адразаецца хвосцік і ў невялікае паглыбленне засыпаецца соль. З дванаццатым ударам гадзінніка прагноз гатовы: цыбуліны, у якіх соль засталася, азначаюць сухія месяцы, а якія «з'елі» ўсю соль – дажджлівы і снежны час. Да навагодняй ночы немцы загадзя рыхтуюць ракеты, феерверкі, бенгальскія агні і шмат іншага, што страляе і рассыпае іскры. Здаўна існавала павер'е, што на парозе Новага года грукатам і мігценнем феерверкаў можна адагнаць ад дома нячыстую сілу, каб яна не прынесла няшчасця ў гэтым годзе. У Грэцыі, як толькі гадзіннік паказвае дванаццаць, кожны, хто сядзіць за навагоднім сталом, атрымлівае кавалак пірага з сюрпрызам. Есці яго трэба асцярожна. Каму трапіць горкі перац, таму не будзе шанцавання. Калі ў кавалачку пірага знойдзецца манета ці пярсцёнак, то гэта да шчасця, кахання і багацця. У Іране на навагодніх сталах абавязкова павінна быць сем страў, назвы якіх пачынаюцца з літары «с». Лічыцца, што іначай гаспадары не будуць шчаслівымі ў наступным годзе. У Італіі, каб назаўсёды развітацца з мінулагоднімі няўдачамі, у апошнія хвіліны старога года з вокнаў будынкаў, нават шматпавярховых, выкідваюць непатрэбныя рэчы. Цікава, што часам уніз ляціць і старая мэбля. У Японіі на Новы год людзі ўпрыгожваюць дзверы галінкамі сасны, бамбука і слівы. Сасна азначае даўгалецце, бамбук – стойкасць, а сліва, што квітнее сярод зімы, абяцае жыццярадаснасць сярод нягодаў жыцця. Яшчэ японцы лічаць, што чалавечае жыццё азмрочваюць сто восем нягодаў. Каб пазбавіцца ад іх, свята Новага года адзначаюць ста васьмю ўдарамі бронзавых званоў. Гукі ўдараў нават транслююцца па радыё і тэлебачанні. Вось так шумна і весела сустракаюць у розных краінах светлае свята – Новы год.



**Рэдкалегія:**

**Аліева Анастасія (9в),**
**Кузьміна Кацярына (9в),**
**Прасаловіч Юлія (9в),**
**Сарокіна Вікторыя (9в),**
**Федарэнка Вікторыя (9в).**
**Рэдактар Юрчанка С.А.**